*Уладзімір КАРЭЛІН,*

*Мікалай МЕЛЬНІКАЎ*

# Іканаграфія св. Іосіфа ў беларускім сакральным жывапісу

*Володимир Карелін,*
*Микола Мельников*

# Іконографія св. Йосифа у білоруському сакральному живописі

*Розглянуто образи св. Йосифа, зафіксовані авторами під час наукових експедицій у храмах Білорусі, а також із деяких музейних колекцій. Проводиться статистичний і порівняльний аналіз образів за часом їх ствіорення, поширеністю в межах республіки, розглядається іконографія окремих творів.*
*Ключові слова: образ, св. Йосиф, дитя-Христос, іконографія, атрибути, поширеність.*

Св. Іосіф Абручнік, які з'яўляецца мужам Дзевы Марыі і нарачоным бацькам Ісуса, паводле Евангелляў (Мф 1. 16; Лк 2. 4) паходзіў з роду цара Давіда. Таксама з Евангелляў вядома, што па прафесіі ён быў плотнікам і навучыў гэтай справе Ісуса Хрыста. Літургічнае шанаванне св. Іосіфа пачалося ў VII ст. на Усходзе і потым распаўсюдзілася на Захадзе. У 1479 годзе папа Сікст IV, які адносіўся да ордэна францысканцаў, увёў святкаванне памяці св. Іосіфа 19 сакавіка, а папа Рыгор XV у 1621 г. абвясціў гэта свята абавязковым для ўсёй Царквы. У 1955 г. папа Пій XII устанавіў свята св. Іосіфа Працаўніка, якое адмячаецца 1 мая. Такім чынам, у каталіцкай царкве памяць Іосіфа шануецца 19 сакавіка і 1 мая, а ў Рускай праваслаўнай царкве – у першую нядзелю пасля Нараджэння Хрыстова[1].

У беларускім праваслаўным іканапісу Іосіф адлюстроўваецца, ў асноўным, разам з дзіцем-Хрыстом і Маці Божай ў такіх сюжэтах, як Нараджэнне Хрыстова, Пакланенне вахвоў, Стрэчанне, Абразанне, Уцёкі ў Егіпет, Святое Сямейства. Пад уздзеяннем заходняга сакральнага мастацтва ў беларускіх храмах шырока распаўсюджаны выявы св. Іосіфа толькі з дзіцем-Хрыстом і, значна радзей, выявы аднаго Іосіфа. Гэтыя два сюжэты і будуць разгледжаны ў дадзеным паведамленні.



*Мал. 2. Абраз Іосіфа з Гродзенскай вобл. Другая палова 18 ст., палатно, алей, 140x80*



*Мал. 1. Дзіця-Хрыстос на руках Іосіфа. Пачатак 19 ст. Палатно, алей, 72x55*

Згодна электроннай базы дадзеных, састаўленай аўтарамі на падставе экспедыцыйных матэрыялаў, агульная колькасць абразоў з выявамі Іосіфа Абручніка разам з Хрыстом (да пачатку 20 ст.) ў храмах і музейных калекцыях Беларусі налічвае 127 адзінак. Па рэгіёнам абразы размеркаваны наступным чынам: Гродзенская вобл. – 67 адзінак (58 – у касцёлах; 9 – у цэрквах); Віцебская вобл. – 21 адзінка (13 – у касцёлах; 8 – у цэрквах); Мінская вобл. – 20 адзінак (15 – у касцёлах; 5 – у цэрквах); Брэсцкая вобл – 16 адзінак (13 – у касцёлах; 3 – у цэрквах); у Магілёўскай вобл. зафіксавана 2 абразы; у

Гомельскай вобл. – 1 абраз. Як бачна, абразы Іосіфа з дзіцем-Хрыстом сустракаюцца пераважна ў касцёлах, што падцвярджае ўплыў заходняга сакральнага мастацтва. Іканаграфія абразоў даволі разнастайная. Найбольш распаўсюджаны роставыя і паясныя выявы святога. Між сабой яны, ў асноўным, адрозніваюцца кампазіцыйным размяшчэннем Хрыста: на адных творах ён знаходзіцца на руках у Іосіфа, на іншых – стаіць ці сядзіць побач на століку. Іосіф звычайна падаецца ў выглядзе сталага мужчыны з густымі валасамі на галаве, пераважна сівымі, і барадой. У руцэ ён можа трымаць свае атрыбуты – расцвіўшы посах ці сцяблiну з кветкамі лілеі. На некаторых творах ў якасці атрыбутаў паказаны плотніцкія інструменты – піла, сякера, гэблік.



*Мал. 3. Дзіця-Хрыстос і Іосіф з Астравецкага раёна. 18 ст., палатно, алей, 240х140*

Частка абразоў, на якіх дзіця-Хрыстос знаходзіцца на руках Іосіфа і датыкаецца ручкай да яго барады, фактычна з'яўляецца копіяй з вядомага твора італьянскага мастака Гвідо Рэні пачатку 17 ст., як на абразе з Брэсцкай вобл. з паяснай выявай Іосіфа (мал. 1), ці паўтарае гэту іканаграфію з некаторымі адхіленнямі, як на другім абразе з Гродзенскай вобл., дзе Іосіф прадстаўлены ў поўны рост (мал. 2).

Варта адзначыць шэраг абразоў з Гродзенскай вобл., якія вылучаюцца асаблівасцямі кампазіцыі. Так, на абразе з Астравецкага раёна (мал. 3) дзіця-Хрыстос, як і на папярэдніх абразах, датыкаецца сваёй ручкай да барады Іосіфа, але ён не знаходзіцца на руках святога, а як бы лунае побач. Амаль уся плошча абраза, за выключэннем лікаў і аголеных частак цела



*Мал. 4. Іканаграфічная схема на абразе з Воранаўскага раёна Гродзенскай вобл. 18-19 ст., палатно, алей, 176х120*

Іосіфа і Хрыста, закрыта адмысловым чаканным абкладам серабрыстага колеру з кветкамі і раслiннымі парасткамі, што надае павышаную дэкаратыўнасць твору і паветраную лёгкасць фігурам. Найбольш разгорнутая іканаграфічная схема змешчана на абразе з Воранаўскага раёна Гродзенскай вобл. (мал. 4). Цэнтральную частку займае роставая



*Мал. 5. Абраз Іосіфа з Драгічынскага раёна Брэсцкай вобл. З калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 18 ст., палатно, алей, 93х72*

фігура Іосіфа, закрытая чаканным абкладам. На левай руцэ ён трымае баслаўляючага Хрыста з дзяржавай, у правай – расцвіўшы посах. Над галавой Іосіфа, на воблаках, у атачэнні сонма анёлкаў-пуцці, знаходзіцца Саваоф са скіпетрам і дзяржавай у руках. Перад ім лунае голуб, ніжэй – анёлак са стужкай з надпісам на лацінскай мове «hic est Filius meus Delectus» (гэта мой сын абраны). У ніжняй частцы абраза двое анёлаў трымаюць у руках сімвалы пакут Хрыста – крыж і цярновы вянок са сцяблінай трыснягу. У правым ніжнім вуглу змешчаны подпіс мастака «Pinxyt T. Kossilowski».

Як адмячалася вышэй, дзіця-Хрыстос можа не толькі знаходзіцца на руках Іосіфа, але сядзець ці стаяць побач на століку, як, напрыклад, на абразе з Драгічынскага раёна Брэсцкай вобл., які зараз захоўваецца ў калекцыі Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (мал. 5; 18 ст., палатно, алей, 93х72). Хрыстос у белым



*Мал. 6. Іосіф з дзіцем-Хрыстом ў сваёй майстэрні з Віцебскай вобл. Пачатак 19 ст., палатно, алей, 170х110*

аблачэнні сядзіць на чырвонай падушачцы побач з Іосіфам, які абодвума рукамі трымае сцяблiну лілеі. За гэту ж сцяблiну правай ручкай трымаецца і Хрыстос; у яго левай ручцы знаходзіцца яблык – «алюзія на будучую місію Хрыста як Збаўцы»[2].

На некаторых абразах Іосіф разам з дзіцем-Хрыстом паказаны ў сваёй майстэрні. Так, на абразе з Віцебскай вобл. (мал. 6; пачатак 19 ст., палатно, алей, 170х110) ён сядзіць побач з варштатам і абодвума рукамі падтрымоўвае амаль аголенага Хрыста, які стаіць на падушачцы ў яго на каленях. На варштаце знаходзяцца плотніцкія інструменты – лучковая піла, сякера і фуганак.



*Мал. 7. Іосіф трымае дзіця-Хрыста. З касцёла Маці Божай Анёльскай у г. Гродна; 18 ст., палатно, алей, 140x90*

Сюжэты асобных абразоў звязаны з навучаннем Хрыста. На алтарным абразе з касцёла Маці Божай Анёльскай у г. Гродна (мал. 7; 18 ст., палатно, алей, 140x90) Іосіф двума рукамі трымае дзіця-Хрыста, які сядзіць на яго каленях. Перад імі, на століку, знаходзіцца раскрытая кніга. Побач з кнігай



*Мал. 8. Абразе Іосіфа з Мінскай вобл.; канец 17 ст., палатно, алей, 77х52*

ляжаць атрыбуты святога – кветка лілеі і тапор. На абразе з Мінскай вобл. (мал. 8; канец 17 ст., палатно, алей, 77х52). Іосіф сядзіць у крэсле. Правай рукой ён падтрымоўвае на сваіх каленях раскрытую кнігу, левай абдымае за плечы падлетка-Хрыста, які стаіць побач і чытае, водзячы пальцам па старонцы. Выявы абодвух персанажаў закрыты чаканным абкладам.

На двух абразах з Віцебскай (мал. 9; 18-19 ст., палатно, алей, 230х110) і Гродзенскай вобласцей зафіксаваны даволі рэдкі для Беларусі сюжэт, дзе паказаны Іосіф, які вядзе за руку падлетка Ісуса. Таксама толькі ў некалькіх выпадках прадстаўлены абразы з асобнай выявай Іосіфа (па пояс ці ў поўны рост). У руках ён можа трымаць сцяблiну лілеі ці кнігу.



*Мал. 9. Абраз з Віцебскай вобл. 18-19 ст., палатно, алей, 230х110*

Такім чынам, абразы з выявай Іосіфа з дзіцем-Хрыстом вылучаюцца даволі разнастайнай іканаграфіяй. Яны адрозніваюцца як кампазіцыйным размяшчэннем і атрыбутамі асноўных персанажаў (Хрыста і Іосіфа), так і наяўнасцю другарадных (анёлы, анёлкі-пуцці, Сафаоф, голуб), а таксама элементамі інтэр'ера і дэкаратыўнасцю аздаблення. Найбольш пашыраны абразы, на якіх Хрыстос знаходзіцца на руках Іосіфа альбо сядзіць ці стаіць побач з ім. Значна радзей сустракаюцца творы, дзе інтэр'ерам з'яўляецца майстэрня Іосіфа. Найменшае распаўсюджанне атрымалі абразы, кампазіцыя якіх звязана з навучаннем Хрыста і яго вандроўкай, на якіх Хрыстос падаецца ўжо не дзіцем, а падлеткам.

[1] Католическая энциклопедия. – М., 2005.
[2] Православная энциклопедия. – М., 2010. – Т. 26.
[3] Музей старажытнабеларускай культуры: Альбом. – Мн., 2004.
[4] Холл Дж. Словарь сюжетов и символов в искусстве. – М., 1999.

***SUMMARY***

***Vladimir Karelin,***
***Nikolaj Melnikov***

***Iconography of St. Iosif in sacral painting of Belarus***

*We consider images of St. Iosif fixed by authors in temples of Belarus during scientific expeditions are considered. The statistical and comparative analysis of icons on time of their creation, prevalence for republic territories is carried out, considered iconography separate products.*
*Keywords: image, St.. Joseph, the Christ Child, iconography, attributes prevalence.*

***Алла ПАВЛЕНКО***

# Царский изограф XVII века живописец Станислав Лопуцкий

***Алла Павленко***

# Царський ізограф ХУІІ століття – живописець Станіслав Лопуцький

*Досліджено творчість одного з російських придворних художників –«живописців» Збройної палати Станіслава Лопуцького. За час роботи у Збройній палаті він виконав чимало замовлень – по створенню «парсун» для царя Олексія Михайловича, розпис полкових стягів, позолота рельєфної різьби. Одним із перших в Росії робив креслення для заводів по виготовленню заліза, географічні карти.*
*Ключові слова: Станіслав Лопуцький, художники-«живописці», цар Олексій Михайлович.*

Русская придворная культура XVII ст. отразила особенности переходного от средневековья к новому времени периода отечественной истории. Придворная среда, царь и его окружение выступили проводниками новаций в изобразительном искусстве. Большую роль в формировании русского искусства нового времени во второй половине